А. Александровіч



Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі
Менск — 1925

А. АЛЕКСАНДРОВІЧ

ПА БЕЛАРУСКІМ БРУКУ

Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі
Менск — 1925

БДВ № 33. Галоўліт № 5384. 2-я Дз. друк. Зак. № 344.
Друк. у ліку 3000 экз.



А. АЛЕКСАНДРОВІЧ

РЫТМ ГОРАДУ

МЕНСКІ РЫТМ

Тым кажу,
каму наша песьня чужая;
праводжу мяжу,
пачынаю.

Ныряй, фабрычны дым,
у дрыжачую сонную сінь,—
разьвясёлы юнацкі уздым
пачуеш у песьнях машын!
Прыкры табе гэты дым?
Точыць сэрца тваё, як туман?
Ныряй, фабрычны дым!
Расьцілай свой дыван...
Зьвіні, сьпеў малады!
Завод, бі ў барабан!

Дым гэты нашых фабрык
праглыне далікатныя вочы.
Страшна?

Сэрца дрыгвою рагоча?
А як чорныя, хворыя фарбы
ліжуць твар рабочых,
вам ня цікава?

Што? гэта зброд сьмяцьця?
Гудзіць, гудзіць навальніцай
аблава
за паясьніцай
жыцьця.

А вечар кадрыль адбівае,
пеніцца вуліцы звон.
Вечар прысеў і сьпявае
на рамах фабрычных вакон.

І гэтая песьня вам страшна?
Бі ў барабан, завод!
Дым выганяй на пашу
на шырокі простор-небазвод.

Ёсьць такія, што ў блеску золата,—
галава, як і грудзі, наўсьцяж.
І прыкра ім, што сьпеў молата
Беларусі Савецкай—наш!

Эх, родная, сталь-машына,
Беларускай рабочай зьвіні!
Песьня тваёй хвіліны
вылівае жалезныя дні.

Хлопцы з дзіцячага дому
купацца ішлі грамадой.
Беларускай зьвінелі, вядома!
Ня ведалі лепшай, другой.

Рабочы вышаў з хаты,
радасьць кіпіць у грудзёх.
— Зьмена, зьмена багатая,—
думка прабегла ў вачох.

Селянін на рынак ехаў,
каняку спыніў і слухае.
Вочы дрыжаць пацехай,
сэрца ўзьняло завіруху.

А хлапцы паскідалі кашулі:
сонца ліжа іх жоўтыя плечы.
Разьвясёлую песьню загнулі
весела, сьмела, карцеччу...

Не спадабалася песьня дзяўчыне,
павярнулася раптам назад.
Беларуская песьня ня згіне—
ёй зьвініць новых дзён варстат!

Ой, ня знойдзеш ты скора бярлогі,
сутарэньня табе не дадуць!
Улетку насыцяць разлогі...
Шчэ ня вывелі ўсю лебяду.

Гуляй! прытулак слаўны:
сад, бульвары, сквер.
Але й тут беларускай забаўнай
успорыць цябе піонэр.

І пальлецца песьня звонкая
ды над вольнай над нашай старонкаю.

Мо сэрца і б'е завірухай?
Але тут хоць ня хочаш, а слухай:

„А ў бары, бары
тры дарожанькі"...

АБРАМ

У цёмным, сырым сутарэньні,
жыве адзінокі Абрам.
Ой, ня раз зьбіраў сьлёзы у жменю.
Ой, ня раз начаваў ля крам...

Да вечару, з самага ранку,
ў гарачы ліпнёвы час
Бутэлькай, а хочаш шклянкай
прадае лімонны квас.

Паклічуць купцы з „ятак“,—
на работу наймецца Абрам:
на паласе сячэ цяляты,
і ня ходзіць тады ён ля крам.

Ня крычыць у бурлівым рынку;
„папера—сьмерць для мух“,
і чэрствую хлеба скарынку
ня ходзіць прасіць у „круг“.

Вясёлы стаў, ён ведае,—
У кішэні будзе рубель.
Увечары пойдзе, сьнедае;
У думкі кідае сябе.

— У полі зьвінелі калосься,
як гораду песьня падпольля...

. . . .

Цяжка, ой, цяжка жылося
Беларусі пад няволяй.
Польшчы рука
у Менску слаўным
панавала,

а Сьвіслач рака
так забаўна
злавала:
Б'е ў берагі,
уздымаючы гул,
скрыгоча:

Што, пан дарагі,
падстаўляе нагу
рабочы?
Дзяржыся!..
Сьвіслач кіпела
няволяй.

Гэй, растуліся! —
гудзела
падпольле.
Панства выла: —
ламаюць
засовы.

і Беларусь радзіла
Кастрычнік
Ліпнёвы!

На вуліцах сьцягі рдзеюць,
над вокнамі ўзломаных крам...
Ня відаць Абрама, дзе ён?
Што цяпер робіць Абрам?

Яму справілі з блудам заручыны,
уцякаючы ўланы-зьвяры.
І Абрам як-бы атручаны...

З ім ня хоча й жыцьцё гаварыць,—
яго хваляй сваёю глынула
і пусьціла з пакатай з гары...

У Абрама ў грудзёх мільганула:
дачку сваю адшукаць,
а дачка ў разгул нырнула,—

ёй сорам Абрама знаць.

Вочы ўзыме маланьнем Абрам
у бязбожную высь-небазвод:
Ну і просіць:—сьвяты Аўраам,
дай дажыць сваіх год без клапот.

А маліцца, адзеўшы талесы,
не хадзіў Абрам у школу
і ламае, ламае пальцы,—
час настаў невясёлы.

А дачка—сэрца чуткае,
вочы—палаючы мак.
Ня кажуць—яна простытутка,—
па каханьню, дык гэта так...

Ой, нядобрыя йшлі пагудкі,
ў сэрцы кожнаму ёсьць цеплата.
Дзяўчыны сэрца чуткае,
а ў галаве пустата.

Не зразумець ёй жыцьцё змаганьня,
не зразумець ёй бурлівы завод.
Ёй прыемна там, дзе каханьне,
дзе перысты лоскат згод.

Дзе „романс мілагучны сопрано“,—
запяе пра вясновыя дні.
Дзяўчыны сэрца сатканае
кудлачыць каханьня агні.

Дык пашто-ж ёй знаць бацьку Абрама?—
ёй жывецца з размахам,—наўсьцяж.
Ёй знаёмым сталі брамы,
ёй знаёмы стаў грубы марш.

Успомніла бацьку—вядома,
але позна яго не спаткаць.
І ў завулках блукае бяздомкам,
сэрца... сэрца за грошы мяняць.

Пра такіх, пра жыцьцё разгоннае
песьня з рабочых хат
цяпер разьліваецца звонам
на свой рабочы лад:

—„Ды ляцяць міскі ды сталіцы“,
немец ходзіць ля спадніцы.
Ой люлі, ой люлі,—
дзеўку замуж аддалі.

Дзеўка, немкаю як стала,
панямецку загуляла.
Ой люлі, ой люлі,—
з Менску немцы уцяклі.
Дзеўка ные, дзеўка плача:
—прападзі ты, доля-кляча!
Ой люлі, ой люлі,—
паны польскія прышлі.
Зноў жыцьцё, і зноў забавы,—
дзеўка мысьліць аб Варшаве.
Ой люлі, ой люлі,—
і палякі уцяклі.
Як знаёмы сталі брамы,
дык і ўспомніла Абрама.
Ой люлі, ой люлі,—
косьці бацькавы згнілі.
Дзеўка плача, сьлёзы роем:
—эх, жыцьцё маё ліхое!..

Дзяўчыны—сэрца чуткае,
вочы—палаючы мак.
Кожны знае—і гэта ня чуткі,
што Абрама дачка прастытутка;
і сьмяяліся й проста так...

Толькі Менск бурапеніць, рдзее,
зьмятае асколкі сьмяцьця!
Ён зьдзейсьніць заводаў ідэі
на крыгах старога жыцьця.

ЎСЕВАЛАДУ МАКАРАВІЧУ ІГНАТОЎСКАМУ

* * *

Бурапеніў, буяніў па бруку
вечар—ліпнёвы гармонік.
Вецер у вокны стукаў,
зьвінелі падковамі коні.
Вуліцы гулам абліты,
пагоні ўздымалі машыны.
Афішы—плякаты—вітрыны:
даклад—лекцыя—мітынг...

* * *

Загуляла чырваньню ўзвышша,
закуваў партызан—кулямёт.
Вечар хоць з сілы і вышаў,
а сьціскаў агнявы палёт.
Бурапеніў, бегаў босы
вечар—бунтар-гарманіст,
бурапеніў, ня то што проста
са стрэхамі дождж гаманіў.

* * *

Крыльлі апёк „бялы ожал“,
памкнуўся крычаць, але змоўк.
Змоўк, бо вінтоўкай стрыножыў
стары партызан—Воўк*).
Вышла з падвалу падпольле—
Беларусі Вольнай быць!
І вуліцы сталі полем
зьвінець агнём барацьбы.

* * *

У рыштках мінулае тае...
Новым—юнацкі гоман.
Беларусь маладая, вітаем
мужыка-комуніста—наркома.

10 лістапада 1924 г.

*) Воўк—пры палякох надпольная клічка У. М. Ігнатоўскага.

АНАТОЛЮ ВОЛЬНАМУ

За вакном мітульга сыпучая,
вецер сьвістам у хату просіцца.
З-за лахмоцьцяў месяц змучаны
ды на п'яніцу-ночку косіцца.

А па вузкіх, брудных вуліцах
ліхтароў сьвет цалуецца з лужамі.
Вакеніцы да сьцен бліжай туляцца,—
вось мо' вецер сарваць і ня здужае...

...Эх, гульбішчам такім я прыяцель,
разам з ветрам зрываў-б вакяніцы,
бо такою гульнёй-багацьцем
успаміны ў грудзёх крынічаць...

ЛЕПШ НЯ СУНЬСЯ...

Сонца, ты любіш купацца па стрэхах,
любіш сесьці на згніўшым крыжы.
Ведай, толькі кажу я ня·сьмехам,
лепш ня суньея са мной на нажы.

Глянь само: ну, як мне не злавацца?
абняло крыж, струхнелы, як пень...
Без сьвятла, бачыш, людзі за працай,—
горне іх бяспрытульны цень...

Мае грудзі сьціскаюцца туга,
злосьць скрыгоча цябе разьбіць.
Але я, як і ты, валацуга,
а працоўным буду служыць.

І ты лепш сьвятла шчырай жменяй
кінь глыбей у жыцьцё, ня блудзі...
Скажа «дзякуй» табе сутарэньне,—
разам вільгаць страхне з грудзі...

Ганарыцца ня варта бляскам;
ёсьць-жа шляхта,—пашто адбіраць?
Ты зірні толькі ў нашыя казкі,
прывітаеш плячмі гэту раць...

Дык пакінь ты лізаць фарбу стрэхаў,
кінь туліць да сябе крыжы.
Калі-ж не, дык кажу я ня сьмехам,
лепш ня суньея са мной на нажы!..

ДРУКАР

І дзень і ноч дрыжыць ліхтар,
сьвінцовы пыл у вокны звоніць.
Над касай весела друкар
трымае літары ў далоні.

Кладзе ў радкі, бы мосьціць брук:
за словам, слова; так артыкул
Вясёлай песьняй творыць друк,
але баліць рука-матыка.

І дзень і ноч машынаў гул
цалуе горача рабочых.
Таму руку, таму нагу
прыцісьне й радасна рагоча:

—Станок заменіць соткі рук,—
што робіш ноч, ён дасьць хвілінай...
Гэй ты, крылаты вольны друк,
цябе вітаю я, машына!

Студзень 1924 г.

ПЕСЬНЯ ВЁСКІ Й ФАБРЫЧНЫХ СТАНКОЎ

У полі зялёнаю ноччу
жалейкай зьвіняць агні.
А ў горадзе песьню рабочым
на колах пяюць рамяні.
Машына песьняй госкае,
стружкі кідае наўкруг,
каб хутчэй, хутчэй у вёску
паслаць сталёвы плуг.
Заўсёды: позна, рана
крынічыць фабрычным жыцьцём.
Каб хутчэй машына-дынама
разьліла свой сьпеў над сялом.

Селянін і рабочы, дарога
працярэблена вамі адна!
Прамінулі часы убогія—
сёньня ў восені наша вясна.
Ні Пятро, ні Ільля аружжам
тваё поле ўбяруць аксамітам.
Ты ня богам, вёска, акружана,
а сваёю рукой працавітай...
Помнім, помнім прыжмураны Ленін
табе, вёска, сказаў:—дай руку!
І сёньня машынай праменьні
ў тваім сэрцы радасьць друкуюць!

Свае хаты аздобіш снапамі,
вёска, сьвята тваё, твой звычай!
Сваю працу сваімі рукамі—
зьбірай, вёска, у свой Ураджай!
Ты сьвяткуеш, сьмяюцца вочы,
каласіцца вясковы сход.
Я вітаю цябе—ад імя рабочых
падарункам трактар паслаў завод!
Хай у сто звонаў зялёны гоман
разьліваюць калосьсі палёў.
Крок за крокам ідзём у жыцьцё мы
з песьняй вёскі й фабрычных станкоў!

БАЦЬКАВА РАДАСЬЦЬ

Гэй шыпі, сьпявай, машына!
Весялей гудзі, кацёл.
Сёньня сьвята, сьвята сына—
залічыўся ў комсамол!

Сёньня сходка фаб‘ячэйкі,
хлопцы—проста ў іх агні.
Эх, сталёвая жалейка,
маёй радасьцю зьвіні!

У віхуры, ў завірусе
ды фабрычнага жыцьця.
Комсамольцам Беларусі
стала роднае дзіця.

І на фабрыцы рухомы
малады мой качагар
выбран членам фабзаўкома,—
весяліся ў домне жар!

Бацьку-ж, радасьці хвіліна,
ў сэрцы шчасьця сытны стол.
Гэй, шыпі, сьпявай, машына,
Ў тваіх сьпевах—комсамол!

ПАДПОЛЬЛЮ

У глыбі, дзе сеткай карэньні,
комсамольцы выкоўваюць волю.
— Прынясе, прынясе вызваленьне
комсамол Беларусі падпольлю!

Падпольле—дзіця рабочых!
Вінтоўка—штык—наган...
Стальлю звоніць друкарня ноччу,
адбівае паўстаньня плян.

А на вуліцах панская варта—
ня нырне ў сутарэньне жыцьця!
Ёй ня ведаць, што там не на жарты
змагаецца волат—дзіця.

Эх, зможам мы паншчыну, зможам!
Сьмерць прыгорне яе ў свой прыпол;
без дарогі пашле ў падарожжа,
размахнуўшы з пляча—комсамол!

БУДУ ПІОНЭР!

Быў дзіцём, жыцьця ня бачыў,
стала лепш—і ён цяпер:
— Гальштук дай мне, няйначай,—
буду добры піонэр.

Падрасту і ў комсамоле
папрацую—й яшчэ як!
Палюбіў я ў нас, у школе
комсамольскі маладняк.

А як вырасту, дык сільны
ў Нашу армію пайду.
Беласток, Гародню, Вільню
я да Менску прывяду.

Я дзіцё машын, заводу;
працу моцна я люблю.
Каб жылі сяляне ў згодзе,
самажнеяк нараблю.

Ёсьць-жа хлопцы, як вароны,—
то на плошчу, то на сквер.
А мне гальштук дай чырвоны,
буду добры піонэр!

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ

Сьмела ўперад дружным сьпевам!..
Раз! Два! Левай!

Шлем, шынэль, штык, патроны...
Дружна ўперад, полк чырвоны!

Барабанам рытмы нашы.
Наш задор у звонах марша.

Гэй, разгонны полк чырвоны,
час прышоў! Раўняй калёны...

Ўзвод за ўзводам, крок за крокам,
дружна ўперад! Фронт шырокі!

Трубіць цемра брудным тронам,
стройся! стройся батальёнам!

Цемра туліцца ў шынэлях...
Зможам, Ленінскай шрапнэляй!

Гэй, разгонны полк чырвоны,
час прышоў! Раўняй калёны!

Сьмела ўперад дружным сьпевам!..
Раз! Два! Левай!...

САМАЛЁТ

М. Маразоўскаму.

Плыві, плыві, наш самалёт
вышэй, вышэй што-год!

* * *

У сінім бяздоньні пагоня
самалёта за самалётам.
Дзяржава—крылатая коньніца,
„Беларусь“ узьнялася, гоніцца!
І хмарай—чырвоныя крыльля,
баявы атрад—эскадрылія.

Самалёт „Беларусь“ кружыцца,—
сілу памерацць, падужацца.
Чуеш? схватка! звоняць
кулямёты за кулямётамі.

У сінім бяздоньні пагоня
самалётаў за самалётамі!

НОВЫ МЕНСК

Вечны гул ня спыняе лізаць камяніцы,
вочы глытаюць рэклямы вітрын.
Гадзіньнік—спакойна на менскай званіцы
б'е глухім звонам дванаццаць гадзін.

Як зьвяры, песьняй сталі скрыгочуць машыны,
блудніцай бегае сонца ля сьцен.
Скрага-жыцьцё, каб ня страціць хвіліны,
Конна імкнецца шукаць сабе зьмен.

Акрываўленай хваляй Менск складкі на твары
змыў з сябе, стаў разьвясёлы юнак.
Песьняй крынічыць! Забаўна штукарыць.
Гудзіць у грудзёх яго Нёмнам вясна.

Спалоханы вецер таемна па стрэхах
за комін прысядзе, коса зірне.
Сонца сьвятла жменю кіне ў прарэху
волату Менску, а разам і... мне.

Баяцца яго, бо падчас бурапеніць;
вуліцай глянь—шмат хто носіць сіняк.
Адстанеш—заменіць сьвінцоваю зьменай!
О, Менск, ты і я—м а л а д н я к!

1923 г.

МАЯ КАЗКА

З ПОЭМЫ „МАЯ КАЗКА“

* * *

Гопчацца вечар па вуліцы,
скрыпіць стаптаны сьнег.
Мінулым маці прытуліцца;
нашу казку раскажа мне:

—Студзень. Шосты год.
Дваццатае сталецьце.
Водзе ў карагод
голад свае сеці.

Холадна. Мароз.
Узор на вокнах віўся...
Сынку добра рос,—
у час цяжкі радзіўся.

* * *

Помню той вечар,
вецер ня выў.
Шукалі за печчу
сьвятое травы.

Малілася хата...
Ў пашане спас...
— Будзе багаты,
ў шчасьлівы час...

Балюча затросься
бацькавы твар.
Цяжка жылося,
мацнеў цяжар.

* * *

І ў гэты вечар
і вецер ня выў,
і сьнег карцеччу
у вочы ня біў.

У горадзе звонка:
вітрыны, агні,
гудзяць беспрассонку
і ночы і дні.

Вясёлы на браме
чырвоны ліхтар.
Шырокая крама,
жывы тавар.

Са звонам ізвозчык
гоніць з гары,
вярбуюць на плошчы
ў кіно ліхтары.

Аркестра склікае
ў кафэ-рэсторан.
Тракцір забаўляе
песьняй цыган.

* * *

І ў гэты вечар
і вецер ня выў.
А вочы карцеччу
кідаў гарадавы...

Глуха ў завулках:
беднота, гальлё.
Лахмоцьце прытулак
падпольлю дало.

Ні хлеба, ні сала,—
галодная сьмерць.
Рабочы ў падвалах
выкоўвае сьмерч.

І рвецца з подпольля:
— далоў царскі стан!
Ня будзе Менск болей—
кафэ-шантан.

* * *

Ды, невясёла ў хаце і сёньня,
грудзі точыць бяда, як іржа.
Рукі зьвязаны... я ў палоне;
другі дзень ты пры мне ляжаў...

Бацька ў тракціры з сябрамі
прапівае сваё паліто...
Бывае, сваімі рукамі
задушыць быў цябе гатоў.

Цярпелі нядолевы кпіны,
жылі кропляю бруднай расы.
Дачакалі-ж вальнейшай хвіліны
сівыя мае валасы.

* * *

Заўсёды клумкі клопатаў,
сьлёзы, бой, грызьня.
Жыцьцё няслося з грохатам,
як пыл ды з-пад каня.

Вадой! і сталі-б сьвежымі
зігзагі вуліц,—шлях.
Жыцьцё такое-б з вежаў мы,—
ўгнаілася-б зямля!

Але сьціскала гора нас,—
тупой сякеры сталь.
І так жыцьцё замораных
душыла йржою хваль.

* * *

Задуменны, нібы вучоны,
па вуліцах бацька блукае.
А ў завулку тракцір разгонны
разгулам яго заклікае.

Не працуе, працы—нічога,
дзе мага яго вочы лезуць.
Раз п'яны страсануў гардавога,
страсануў, пяючы марсэльезу.

Судзілі. Сядзеў. Вышаў.
А ў сэрцы кіпіць непагода...
Кароткія-ж ніткі зацішша
увосені шостага году.

* * *

Пеніцца сэрца фабрык,
кіпіць прыгнечаньня вар.
На тварах бунтарскія фарбы,
ля домны злуе качагар!

Не здарма-ж быў і бацька з рабочых
з помстаю слухаў „лісткі“...

Сьляпою, абдрыпанай ноччу
ўляцелі да іх крыжакі.

І толькі прайшла хвіліна,
„вялікай дзяржавы сыны“:
бацьку далі дамавіну,
яго сябрам—кайданы...

* * *

Журбу мінуўшчына будзіць,
мінулым намоклі скроні...
На твары матчыным сёньня
цень успамінаў блудзіць.

Маю казку мне расказала...
— Больш ня ведаю бацькі свайго!
Праўда, яшчэ расказала
нядолю жыцьця свайго...

ЧУЖЫНА

...І тчэ забыўшыся рука,
Замест пэрсідзкага узору, —
Цьвяток радзімы васілька.

Максім Багдановіч.

НА МАГІЛУ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

I

Павевы праменьняў на скалах
прасьпелаю ласкай дрыжаць,
а ў грудзёх маіх злавала
вечарынкай калючай імжа.

Мора плешча халодным звонам,
ліжа пырскамі бераг круты.
Ня зьвініць тут зялёны гоман,
не трасуцца лазой балаты.

То шэрай, то сіняю хваляй
мора твар свой прыкрые й злуе.
Б'е навалай, асінай дрыжалі
на хвалях чаўны... Зальле!..

Зальле зьвярына, замучыць,
валам сьпяе сьмерці вальс.
Палошчаць чаўны, як анучу,
плошча сініх хваль.

II

Падплывай, параход, на бераг!
Дай гудок, і якар нырне.
А кудзеляй туман, як нерат,
сваёй вільгацьцю мучыць мяне.

Параход атуляе цемень.
Вечар, пяшчоты кінь!
Скора ўбачу жывыя карэньні,
залатыя агні-маякі.

Мае думкі хваля калыша,
калыханку бурай пяе.
Змоўкні, мора, як сіняе ўзвышша,
акуніся ў думкі мае...

З тэй пары праміну лі гады...
Ну, хутчэй, хутчэй, параход!
Тут памёр наш пясьняр малады
у Той Самы Семнаццаты год.

III

Ой, за Ялтай, у полі,
сярод Крымскіх гор
шырокі курган магілы.
Сонца сваволіць,
тчэ жоўты узор,
і вецер гуляе пылам.

Кіпарысы, каменьні,
цыкады, крыжы,—
шырокі курган магілы.
Нявольніца калені
сагне й пабяжыць,
і знова жыцьцё застыла.

Ой, неба муліць
каўнер Крымскіх гор;
сонца Ай-Петры спавіла.
Ня чую зязюлі,
не яе перабор
над вялікай, забытай магілай!

IV

Страшыць навальніцай
з-за горных сьцен
Крым.

Чорная табліца:
„Студэнт Максім“...

* * *

Хвілінай, толькі хвілінай
заіржала сэрца жалем.
Ой, ня ласкай віталі Максіма
праменьні далёкай чужыны.
Сьціскае яго суглінак,
ветры грудзі стапталі...
Хвілінай, толькі хвілінай
заіржала сэрца жалем.

19 жніўня 1924 г.

Ялта.

ЗЬМЕСТ